# ПАДЫХОДЫ ДА ЭКСПАНАВАННЯ МУЗЫЧНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ У МУЗЕЯХ БЕЛАРУСІ

***С. Э. Чавус,***
*аспірант БДУКМ*

Сёння музычныя інструменты складаюць значную частку музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Яны з'яўляюцца аб'ектамі калекцыяніравання для самых розных музеяў. Зразумела, што прынцыпы экспанавання любых музейных прадметаў у значнай ступені залежаць менавіта ад профілю ўстановы.

Вялікая колькасць музычных інструментаў захоўваецца ў этнаграфічных і краязнаўчых музеях (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Барысаўскі аб'яднаны музей, Лепельскі раённы краязнаўчы музей і інш.). Звычайна ў экспазіцыях музеяў азначаных профіляў прадстаўлены інструменты, якія выкарыстоўваліся ў народным асяроддзі. Адпаведна, яны паказаны ў кантэксце традыцыйнай культуры канкрэтнага рэгіёну. Радзей трактуюцца ў якасці элемента культуры горада, ці мястэчка і ілюструюць прафесійную музычную культуру.

У літаратурных музеях народныя музычныя інструменты часцей за ўсё выкарыстаны ў экспазіцыі з мэтай стварыць пэўны мастацкі вобраз. Падобны прынцып, напрыклад, выкарыстаны ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. Часам інструменты ілюструюць творчую спадчыну літаратараў, якія ў сваёй дзейнасці звярталіся да гэтага вобразу. Так, у экспазіцыі Музея-сядзібы Францішка Багушэвіча «Кушляны» змешчаны дудка і скрыпка, якія нагадваюць пра паэтычныя зборнікі «Дудка беларуская» і «Смык беларускі».

Розныя падыходы выкарыстоўваюцца музейнымі супрацоўнікамі пры стварэнні мемарыяльных экспазіцый. Напрыклад, паказаныя ў Мемарыяльным музеі У. Мулявіна інструменты, якія належалі музыканту, «ператвараюць музейнае памяшканне ў падабенства студыі, сцэны». Музейная экспазіцыя таксама пабудавана так, каб стварыць пэўны мастацкі вобраз. Але найбольш характэрным для мемарыяльных музеяў з'яўляецца ансамблевы тып экспазіцыі, пры якім захоўваецца альбо рэканструіруецца (цалкам ці часткова) інтэр'ер (прыклад – Літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа). Акрамя таго, стварэнне ансамблевых экспазіцый набывае асаблівае значэнне на сучасным этапе развіцця музейнай справы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі, паколькі ўзрастае колькасць музеефікаваных аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Музычныя інструменты адыгрываюць важную ролю пры стварэнні экспазіцый ў палацах і сядзібах, паколькі інструментальная музыка з'яўлялася неад'емнай часткай свецкай магнацкай і шляхецкай культуры. Так, у экспазіцыі Замкавага комплекса «Мір» паказаны рэканструяваныя музычныя інструменты эпохі Рэнесансу і ранняга барока [1, с. 91; 9].

Музычныя інструменты таксама сустракаюцца ў экспазіцыйнай прасторы беларускіх музеяў ваенна- і агульнагістарычнага профілю, напрыклад, у раздзеле экспазіцыі «Зашумела, загуло...» Любанскага музея народнай славы, якая распавядае пра ўдзел жыхароў краю ў гістарычных падзеях пачатку XX ст. Іншы прыклад – Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, што захоўвае музычныя інструменты, якія належалі партызанам у гады вайны. Варта адзначыць, што ў музеях гэтага профілю мала ўвагі надаецца непасрэдна традыцыі вайсковага грання, хаця асобныя вайсковыя інструменты ўсё ж прадстаўлены ў экспазіцыях.

У нашай краіне найбольш значная ў колькасным і якасным плане калекцыя музычных інструментаў захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Яна налічвае амаль 300 адзінак захавання асноўнага фонда. Значная роля ў раздзеле пастаяннай музейнай экспазіцыі «Мастацтва ў гарадской культуры канца XIX – пачатку XX стст.» адводзіцца менавіта музычным інструментам, якія дастаткова поўна адлюстроўваюць прафесійную музычна-інструментальную культуру. Тут шырока прадстаўлены медныя духавыя і струнны смычковыя інструменты, а таксама музычныя прылады. Экспанаты дэманструюцца на невялікім узвышэнні, ствараючы ўражанне сцэны, падрыхтаванай да ігры аркестра [8].

У 1991 г. ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі (цяпер Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь) адбылася рэспубліканская выстава музычных інструментаў, арганізаваная І. Д. Назінай, на якой дэманстраваліся акадэмічныя і народныя музычныя інструменты. Вялікае значэнне мела і выданне каталогаў для гэтых падзей. Выстава беларускіх народных інструментаў адлюстроўвала характэрныя асаблівасці бытавання народных інструментаў у традыцыі беларусаў, а таксама паказвала вынікі дзейнасці сучасных майстроў [4]. Па завяршэнні працы выставы шэраг прадметаў быў перададзены ў згаданы музей і папоўніў калекцыю музычных інструментаў [8].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адна з найбольш цікавых у мастацкім плане экспазіцый музычных інструментаў існавала да нядаўняга часу ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Аўтарам і стваральнікам экспазіцыі выступіў супрацоўнік Творчай лабараторыі па вырабе музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў У. М. Гром. Экспазіцыя народных музычных інструментаў была пабудавана па колу, падзелена адпаведна народных каляндарных святаў у гадавым цыкле. У цэнтры на столі размяшчаліся сурмы – духавыя музычныя інструменты, якія сімвалізавалі нябесную прастору, унізе да кола былі прымацаваны ў вялікай колькасці прымітыўныя язычковыя духавыя музычныя інструменты – саломкі і чароткі, сімвалізуючы зямлю. Разам з тым структура экспазіцыі была падначалена агульнай навуковай класіфікацыі музычных інструментаў і падзелена ў адпаведнасці з ёй на 4 раздзелы: аўтафонныя (самагучальныя), мембранныя, духавыя і струнныя музычныя інструменты. На жаль, пасля пераносу экспазіцыі ў іншае памяшканне, мастацкае рашэнне У. М. Грома не было захавана.

У 1992 г. у Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» на аснове калекцыі, сабранай У. Х. Бярберавым, адчынілася доўгатэрміновая выстава «Музыка вячорак», якая дагэтуль знаёміць наведвальнікаў з музычнай культурай беларускіх вёсак і мястэчак. Асаблівасць яе ў тым, што музычныя інструменты, размешчаныя ў вітрынах, аб’яднаны ў так званыя вясельныя гурты – спалучэнні, характэрныя для беларускіх народных інструментальных капэляў. Пад час экскурсій для наведвальнікаў уключаецца аўдыёсуправаджэнне [5; 6, с. 103].

Адзіны музей у нашай краіне, у якім калекцыяніраванне музычных інструментаў абумоўлена яго профілем, – Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь. Яго можна непасрэдна аднесці да музычных музеяў. У ім сабрана адносна невялікая колькасць музычных інструментаў – усяго каля 100 адзінак захавання, якія вылучаны ў асобную калекцыю. Туды ўваходзяць прафесійныя і народныя інструменты [7]. Не надта багаты музейны збор ў спалучэнні з шырокім профілем музея паставілі перад стваральнікамі экспазіцыі цяжкую задачу. У ёй былі размешчаны муляжы найбольш старажытных духавых інструментаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі падчас археалагічных раскопак, копіі кніжных ілюстрацый з выявамі музычных інструментаў і г.д. Значная колькасць экспануемых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычных інструментаў – вырабы сучасных майстроў. Тым не менш, музычныя інструменты (пераважна фабрычнай вытворчасці) прадстаўлены амаль ва ўсіх раздзелах экспазіцыі: «Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях»; «Музычная і тэатральная культура X–XIX стст.»; «Беларуская музычная культура XX ст.», а таксама ў мемарыяльных пакоях, прысвечаных выбітным майстрам беларускага музычнага і тэатральнага мастацтва. На нашу думку, у экспазіцыі адзінага ў краіне музычнага музея неабходна ўзмацніць акцэнт на аўтэнтычных музейных прадметах, падкрэсліць іх значнасць і зрабіць больш атрактыўнымі для наведвальнікаў (у тым ліку і сродкамі музейнага дызайну). Магчыма, варта вылучыць найбольш цікавыя музычныя інструменты ў асобны раздзел.

Такім чынам, музычныя інструменты ў музеях Беларусі прадстаўлены дастаткова шырока, аднак пры наяўнасці ўнікальных музейных прадметаў, музычных інструментаў як прафесійных, так і народных (напрыклад, скрыпка вытворчасці Дж. П. Маджыні 1596 г. у калекцыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, дуда ў зборы Лепельскага раённага краязнаўчага музея), іх экспазіцыйны патэнцыял застаецца амаль нераскрытым. Паказальным таксама з'яўляецца адсутнасць музычных інструментаў у зборах музеяў мастацкага профілю пры тым, што яны ў розныя часы безумоўна выраблялiся і аздабляліся майстрамі, як прафесійнымі, так і народнымі, менавіта як творы мастацтва. Акрамя таго, дастаткова складанай задачай застаецца адлюстраванне ў музейнай экспазіцыі генетычнай функцыі музычных інструментаў – дэманстрацыі гучання інструмента для наведвальніка. Часцей за ўсё дадзенае пытанне наогул ігнаруецца. Неабходна адзначыць, што стварэнне «экспазіцыі, якая гучыць» пры дапамозе сучасных тэхнічных сродкаў, а таксама размяшчэння побач з арыгіналамі дзеючых копій – адзін з важных накірункаў дзейнасці ў замежных музеях. У ідэале, музычны інструмент павінен разглядацца ў музейнай экспазіцыі адначасова як твор мастацтва, гістарычная крыніца і прылада для здабывання гуку.

1. Музеі Беларусі : даведачнае выданне. – Мінск, 2008. – 560 с.

2. *Музей В. Г.* Мулявина // Белорусская государственная филармония [Электронный ресурс]. – 2012. – Режим доступа: http://philharmonic.by/ru/philharmonic/collectives/44-museum-muliavina.html.

3. Музычная і тэатральная культура X–XIX ст. // Дзяржаўны музей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://by.theatre-museum.by/expositions/music-x.html.

4. Музычныя інструменты : каталог першай Рэспубліканскай выставы / І. Д. Назіна, Л. А. Александрэнка. – Мінск : Б. в., 1991. – 47 с.

5. *Сабалеўская, І.* Музейна-выставачны комплекс / І. Сабалеўская, В. Казлоўскі // Дзяржаўная ўстанова «Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» [Электронны рэсурс]. – 2013. – Рэжым доступу: http://www.zaslaue.by/page.php?parent=18&issue_id=19&lang=be.

6. *Скарабагатчанка, А. В.* Беларускія народныя музычныя інструмен- ты XX ст. / А. В. Скарабагатчанка. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 397 с.

7. Спіс калекцыі музычных інструментаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры // Бягучы архіў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры.

8. Спіс калекцыі музычных інструментаў Нацыянальнага гістарыч нага музея Рэспублікі Беларусь // Бягучы архіў Нацыянальнага гіста- рычнага музея Рэспублікі Беларусь.

9. Тэматыка-экспазіцыйны план экспазіцыі «Сталовая Ізба» ў Замкавым комплексе «Мір» // Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ